■ У рытме сэрца

# ПА ВЯСЁЛЦЫ ДА СОНЦА ІШОЎ...

## Як адгукаюцца вершы Петруся Броўкі сёння



**Пра Петруся Броўку ў мяне з дзяцінства ўражанне як пра паэта, які складе вельмі рытмічныя вершы. Такімі былі тыя творы, што мы чыталі ў школе. Таму вучыць яго вершы на памяць было даволі проста — яны неяк самі ўзнаўляліся, варта было толькі задаць рытм. Прычым гэта тычылася і вершаў, і буйных паэтычных твораў. Чытаў ты верш «Пахне чабор» ці паэму «Голас сэрца» — усё было зразумела, усё на месцы, неяк вельмі проста кладзіся словы, а галоўнае, з дакладным сэнсам. Вершы Броўкі дапамагалі атрымліваць добрыя адзнакі па беларускай літаратуры не толькі тым, хто асабліва любіў чытаць. І між іншым, праз іх прыходзіла адчуванне беларускай мовы, у якой так арганічна гучаць рыфмы, дзякуючы якім падкрэсліваецца мілагучнасць слоў. Прынамсі, дзякуючы ў тым ліку гэтаму паэту я зразумела: беларуская мова — гэта так натуральна...**

Сапраўды, тады нам абсалютна дакладна было зразумела, чаму Пятрусь Броўка — народны паэт Беларусі, чалавек, узнагароджаны шэрагам прэстыжных (на той час) літаратурных прэмій: Сталінскіх, Ленінскай, таксама беларускіх — імя Я. Коласа, Я. Купалы. Тады мы гэта прымалі як факт асаблівай адзнакі творчасці і імкнуліся зразумець: за што? Адказы зноў-такі знаходзіліся проста. Яны былі раствораныя ў тэматыцы вершаў, дзе ўсё было абумоўлена гістарычна (у залежнасці ад таго, якія часы натхнялі паэта на той ці іншы твор), усё было выверана адпаведна з яго тагачасным светаўспрыманнем. Адказы былі і ў пафасе слоў, і ў эмоцыях, якія перажываў чалавек, калі заўважаў, як мяняецца жыццё вакол яго. І сам таксама мяняўся.

Ці не сацыяльныя змены зрабілі яго паэтам? Дакладна, яны далі яму магчымасці. Таму што якія магчымасці маглі быць у хлопчыка з беднай шматдзетнай сялянскай сям'і, які з дзяцінства быў вымушаны дапамагаць бацькам па гаспадарцы? Праўда, усё ж гэтыя сяляне разумелі, што дзіця павінна вучыцца: царкоўна-прыходская школа дапамагла. Дзякуючы ёй пасля 1918 года падлетак запатрабаваны як пісар ці рахункавод пры важных установах новай улады. А потым яшчэ пачынае пасылаць допісы ў газеты (у тым ліку друкаваўся і ў «Звяздзе»). Вядома, новае жыццё яго натхняла: на пачатку 20-х гадоў мінулага стагоддзя Пятрусь Броўка — актыўны камсамолец. Далей шлях прыводзіць яго ў газету «Чырвоная Полаччына», дзе пачалі друкаваць яго вершы. Вось як ён узгадвае гэты момант: «Не пытайся пра гэта, // Бо адказу не дам. // Як зрабіўся паэтам, // Я не ведаю сам. // Свой радок на паперы // Не чакаў я спаткаць, // Проста сэрца без меры // Захацела спяваць».

Такіх, як ён, каму хацелася спяваць, альбо наогул выказвацца ў паэзіі па-беларуску, было нямала, іх аб'ядна́ў «Маладняк». Яго сэрца тады, відаць, выпрацоўвала свой рытм, які б пасаваў і новаму жыццю, і перадаваў бы пульсацыю ўласных пачуццяў. Было і тое, і тое. Паэзія, створаная згодна з першым пунктам, адна. Паэзія, адпаведная другому, адчуваецца і адгукаецца зусім інакш. Дзіўна: гэта створана адным чалавекам. Ён мог быць палымяным правадніком ідэй, якія фіксаваў і апяваў змены ў жыцці народа, што адбываліся навокал пад кіраўніцтвам партыі. Моц і сіла, прамата і рашучасць у творах. Відаць, шчыра: змены ж былі. Яго Беларусь мянялася? Так. Па вялікім рахунку, былі надзеі на лепшае (яны дэклараваліся). Ён мог праверыць дэкларацыі і на сабе — напрыклад, меў магчымасць працягваць адукацыю ў БДУ. Як жа не верыць у магчымасці? А чалавеку заўсёды хочацца верыць у лепшае. Ключавое слова — «верыць» (нават калі нешта можа быць і не так, як здаецца), яно не вымагае сумнення.

І лірыка яго (у тым ліку інтымная) — з думкамі пра шчасце, якое ці ёсць, ці магло б быць, ці чалавека пазбавілі шчасця жыцця. Але тут, дзе чалавек сам-насам з сабой, Броўка больш тонкі, тут калі баліць, то баліць, і ён не баіцца быць у гэтым слабым ці занадта расчуленым. Як у той жа паэме «Голас сэрца», напісанай ужо пасля вайны, якую ён прайшоў як ваенны карэспандэнт, але яшчэ пісаў у гэты час і вершы ваеннай тэматыкі, нават патрыятычную паэму «Беларусь», дзе ўзгадваецца славутая гісторыя Айчыны нават ад Грунвальда і іншых войнаў, калі беларусы даказвалі, што ўмеюць сябе бараніць. Але паэма-плач, паэма — памятнік маці, якая загінула ў канцлагеры, была створана ў 1960-м, калі Броўка паехаў у Асвенцым. Ён жыў некалькі гадоў з адчуваннем незваротнай страты, але сказаць пра яе змог толькі тады, калі ўявіў, што давялося перажыць дарагому чалавеку. У ёй шмат асабістага, сардэчнага. Гэтае асабістае перарастае ў антыфашысцкі пафас: Броўка па натуры, відаць, быў чалавек-грамадзянін. Гэта ад слова «грамадства». У яго разглядзе грамадства — з'ява не толькі сацыяльная, але і палітычная, палітычна выверaная (варта ўзгадаць хаця б паэму «Заўсёды з Леніным»). Ён нібыта сябе ўсяго прапускаў праз сіта грамадскай значнасці, а грамадскую праўду ставіў вышэй за персанальную чалавечую. Можа, таму няпростыя ўмовы існавання айчыннай літаратуры ў 30-я — 40-я гады яго не закранулі. І адразу пасля вайны ён адчуў сваю яшчэ большую запатрабаванасць і як літаратар: вярнуўся кіраваць часопісам «Полымя», потым быў выбраны старшынёй праўлення Саюза пісьменнікаў БССР. Імя Петруся Броўкі сёння носіць дзяржаўнае энцыклапедычнае выдавецтва, якое было створана дзякуючы яго клопату (выданне самой энцыклапедыі было адзначана Дзяржаўнай прэміяй БССР) і развівалася пад кіраўніцтвам народнага паэта Беларусі. Пасля вайны ў яго выходзяць кнігі (не толькі вершы і паэмы, але аповесці і раман «Калі зліваюцца рэкі»). Яго творы адзначаюцца самымі прэстыжнымі прэміямі. І калі пісаць паспяваў гэта чалавек, вельмі заняты адначасова грамадскай дзейнасцю? Таму што Пятрусь Броўка быў больш за 20 гадоў дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР, пазней СССР. Да таго ж ён дзеяч айчыннай навукі — быў акадэмікам Акадэміі навук БССР. Адзін чалавек — а столькі спраў. Безумоўна, герой, Герой сацыялістычнай працы (у 1972 годзе). А яшчэ колькі іншых узнагарод — з іх 3 ордэны Леніна (найвышэйшая ўзнагарода ў СССР)...

Наогул, калі цяпер думаць пра гэтую асобу, то ў ёй шмат здзіўляе. Маладосць — у творчым пошуку. Бойкі стыль, нешта ад зямлі і прыроды, тое, што не можа быць штучным. Сталасць — з трывалай упэўненасцю савецкага чалавека ў аднойчы выбраным шляху, якому ён ніколі не зменіць і ў якім не будзе нагоды нават сумнявацца: памёр Пятрусь Броўка ў 1980-м годзе. Яго кнігі выходзілі нават пасля смерці, у тым ліку збор твораў у 9-ці тамах.

Але калі ў дзяцінстве творы Петруся Броўкі дазвалялі адчуць пах і смак беларускай мовы (найперш гэта), то цяпер, праз гады (нават з іншай эпохі) больш хочацца разважаць пра тэмы, якія яго натхнялі. Хочацца разважаць з пункту гледжання айчыннай літаратуры і следу творцы ў ёй, а таксама пра ролю творцы ў грамадстве. Вядома, што літаратура — адбітак часу, у якім адлюстравана грамадства з яго галоўнымі ідэямі і ладам жыцця. Калі зыходзіць з гэтых пазіцый, то творчасць паэта Броўкі вельмі паказальная. Яна дае магчымасць адчуць і вывучаць эпоху, цяпер ужо далёкую, а для некаторых нашых суграмадзян амаль нерэальную; зразумець, што гэта было і чаму некаторыя людзі дагэтуль так шчыра трымаюцца за ўспаміны аб тым часе. У рытме той эпохі стукала сэрца Петруся Броўкі, які быў паэтам савецкай Беларусі.

Тым не менш ёсць у творчасці нашых савецкіх літаратараў адна бясспрэчная каштоўнасць: яны пісалі з пазіцый існавання беларускай культуры, успрымалі Беларусь як рэспубліку, утвораную асобным народам, са сваім мінулым, традыцыямі, мовай і светаадчуваннем. Вось гэта самае каштоўнае ў іх атрымалася перадаць творцам наступнага пакалення як галоўную нашу літаратурную традыцыю.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**
*tsimoshyk@zviazda.by*

**Пятрусь БРОЎКА**

### ЗАПАВЕТНАЕ

Да роднай зямлі
Я навечна прырос
Карэннямі сосен усіх
І бяроз.
Як вецер у буру
Б'е ў вокны і дах,
Так сэрца маё
Неспакойна ў грудзях.
Як ранняй вясною
Іскрыцца расой,
Так нівы я ў горы
Абсыпаў слязой.
Як шчасце між бору
Пабачыць мой зрок, —
Здаецца, ўздымаюся
Я да аблок.
Тады заспяваю,
Забыўшы бяду,
І, як па вясёлцы,
Да сонца іду.

* * *

У любімай мове, роднай, наскай,
Ах, якія словы: «Калі ласка!..»
Як звіняць яны сардэчнаю струною,
Праз усё жыццё ідуць са мною.
Трапіць госць у будзень, а ці ў свята:
— Калі ласка, калі ласка, ў хату!
Не паспелі сесці пры сустрэчы,
Як патэльня засквірчэла ў печы,
Ды і чарка бліснула дарэчы.
Бульба, смажаніна і каўбаска,
Пакаштуйце, людцы, калі ласка!
Хлопец кажа дарагой дзяўчыне:
— Калі ласка! Будзеш гаспадыняй!..
Эх, жыццё збудуем мы прыгожа,
Ўсе з табой нягоды пераможам.
Гром грыміць. З нябёсамі размова:
— Калі ласка, цёплы дождж вясновы!
І не вельмі буйны і не рэдкі —
На сады, на пушчы, на палеткі,
На грыбы, на ягады, на кветкі...
— Калі ласка! — наш зварот бясконцы.
Мы гаворым ранішняму сонцу:
— Калі ласка, сонца, выйдзі з хмары,
Радасцю аблашчы нашы твары,
Ты ўзнімі з сабою нашы мары!
— Калі ласка!.. — нашай роднай мовы
Шчырыя і ветлівыя словы.